## Алфавіт

| Абрыс | Назва | Вымаўленне | Абрыс | Назва | Вымаўленне |
|---|---|---|---|---|---|
| A a | а | а | N n | эн | н |
| B b | бэ | б | O o | о | о |
| C c | цэ | ц/к | P p | пэ | п |
| D d | дэ | д | Q q | ку | кв |
| E e | э | э | R r | эр | р |
| F f | эф | ф | S s | эс | с |
| G g | ґэ | ґ (выбухн.) | T t | тэ | т |
| H h | га | г (фрыкат.) | U u | у | у |
| I i | і | і | V v | вэ | в |
| J j | ёта | й | X x | ікс | кс |
| K k | ка | к | Y y | іпсілён | і |
| L l | эль | ль | Z z | зэта | з |
| M m | эм | м | | | |

## Галосныя і дыфтонгі

Г а л о с н ы я бываюць працяглымі і кароткімі. Працягласць пазначаецца рысай (ā), кароткасць — дужкай (ă). Працягласць і кароткасць пазначаюцца тады, калі гэта важна для правільнай пастаноўкі націску, а таксама для адрознівання некаторых граматычных форм.

Д ы ф т о н г — гэта спалучэнне дзвюх галосных у адным складзе:

| | | | |
|---|---|---|---|
| **ae** | [э] | aera | [э́ра] |
| **oe** | [э] | foedus | [фэ́дус] |
| **au** | [аў] | aurum | [а́ўрум] |
| **eu** | [эў] | Europa | [эўро́па] |

З а ў в а г і.

1. Калі ў спалучэннях **ae**, **oe** над другім элементам стаіць двукроп’е або знак працягласці, яны дыфтонга не ўтвараюць і чытаюцца асобна:

| | | | |
|---|---|---|---|
| **aë** | [аэ] | aër | [а́эр] |
| **oē** | [оэ] | poēta | [поэ́та] |

2. Калі спалучэнне **eu** знаходзіцца ў канцы слова перад зычнымі **m**, **s**, яно дыфтонга не ўтварае і чытаецца асобна:

| | | | |
|---|---|---|---|
| **eum** | [эум] | meum | [мэ́ум] |
| **eus** | [эус] | meus | [мэ́ус] |

## Зычныя і спалучэнні з імі

| Зычны/ спалучэнне | Пазіцыя | Вымаўленне | Прыклад | |
|---|---|---|---|---|
| **c** | перад [э], [і] | [ц] | Cicero | [цы́цэро] |
| | у астатніх выпадках | [к] | accuso | [акку́зо] |
| **s** | паміж галоснымі | [з] | accuso | [акку́зо] |
| | у астатніх выпадках | [с] | saeculum | [сэ́кулюм] |
| | у грэчаскіх словах | | philosophia | [філёсо́фия] |
| **qu** | любая | [кв] | quinque | [кві́нквэ] |
| **su** | перад **a**, **e** | [св] | suadeo | [сва́дэо] |

| Зычны/ спалучэнне | Пазіцыя | Вымаўленне | Прыклад | |
|---|---|---|---|---|
| **ngu** | перад галосным | [нгв] | anguis | [áнґвіс] |
| **ti** | перад галосным | [цы] | ratio | [рáцыо] |
| | 1) перад зычным | [ті] | Latina | [лятíна] |
| | 2) пасля **s**, **t**, **x** | | mixtio | [мíкстіо] |
| | 3) калі **i** працяглае (ī) | | totīus | [тотíус] |
| | 4) на стыку марфем | | alt-ius | [áльтіус] |
| **th** | любая | [т] | cithara | [цытáра] |
| **ph** | любая | [ф] | Sphinx | [сфінкс] |
| **rh** | любая | [р] | Pyrrhus | [пíррус] |
| **ch** | любая | [х] | Gracchus | [ґрáкхус] |
| **sch** | любая | [сх] | schema | [схэ́ма] |
| | | Дадатковыя правілы | | |
| **s** | каля **m**, **n** (**sm**, **ns**) | [з]/[с] | schisma | [схíзма]/ [схíсма] |
| **x** | паміж галоснымі | [гз]/[кс] | exempar | [эгзэ́мпляр]/ [эксэ́мпляр] |

## Правілы націску

1. У словах з двух і больш складоў націск ніколі не ставіцца на апошні склад.

2. У словах з двух складоў націск ставіцца на першы склад: ró-sa [ró-за].

3. У словах з трох і больш складоў месца націску вызначаецца па перадапошнім складзе:

а) калі ў перадапошнім складзе працяглы галосны або дыфтонг, націск ставіцца на перадапошні склад: oc-c**ī**-do [ок-цы́-до], the-s**áu**-rus [тэ-сáў-рус];

б) калі ў перадапошнім складзе кароткі галосны, націск ставіцца на трэці склад ад канца: lí-qu**ĭ**-dus [лí-кві-дус];

в) калі ў перадапошнім складзе галосны перад двума і больш зычнымі, націск ставіцца на перадапошні склад: ma-gí**s**-**t**er [ма-ґíс-тэр];

г) калі ў перадапошнім складзе галосны перад галосным, націск ставіцца на трэці склад ад канца: ná-**ti**-**o** [нá-цы-о].